# КУДЫ РУХАЦЦА І ЯК РАЗВІВАЦЦА

## ВЕДАЮЦЬ У ТАА «КАНТРЫ-МІЛК»



**Быць кіраўніком — гэта не толькі пачэсна, але і вельмі адказна. Тым больш калі гэта сельскагаспадарчае прадпрыемства, а ты — жанчына. Людміла ВОЛАХАВА на пасадзе дырэктара акцыянернага таварыства з абмежаванай адказнасцю «Кантры-Мілк» чатыры гады. Спадчына ёй дасталася незайздросная, шмат было праблем. Але за той час, што стаіць ля штурвала гаспадаркі, яна змагла стабілізаваць сітуацыю, значна павысіць вытворчыя паказчыкі, з'яднаць калектыў, сабраць выдатных спецыялістаў-аднадумцаў. «Людміла Аляксандраўна валодае дарам перакананні, літаральна фантануе новымі ідэямі», — кажуць пра яе падначаленыя.**

— Наша гаспадарка невялікая, займаецца вытворчасцю малака. Тут налічваецца 2998 гектараў зямлі, 1988 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 910 дойных кароў, працуе 122 чалавекі. Адкорм і мясны кірунак у нас адсутнічаюць, — уводзіць у курс справы Людміла Волахава. — Зямлі хапае, каб забяспечыць жывёлу якаснымі кармамі і закрыць дзяржзаказ. Летась у дзяржаўныя засекі пастаўлялі піваварны ячмень і пшаніцу. Сёлета адгрузілі толькі ячмень. Ураджайнасць збожжавых і зернебабовых 36,7 цэнтнера з гектара. Таксама сёлета добра ўрадзіў рапс — 36,5 цэнтнера.

«Кантры-Мілк» у сучасным выглядзе існуе пяць гадоў: у 2014-м да таварыства далучылі сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў «Вербнае» шляхам рэарганізацыі. Поспехі тут былі далёка не зорныя. Неабходна было наладжваць культуру земляробства, кардынальна мяняць тэхналогіі ў жывёлагадоўлі.

— Малако мы здаём на Кобрынскі масласырзавод — штодзень 14,5-15 тон. Цяпер у сярэднім доім па 17,6 літра на адну фуражную карову. За сем месяцаў прадалі прадукцыі экстра-класа 92,3 працэнта. Астатняе пайшло вышэйшым гатункам. За гэты ж перыяд таварнасць малака склала 92,9 працэнта. Ніжэй за гэты ўзровень імкнёмся не апускацца, — канстатуе мая суразмоўніца.

— Каровы ў нас на стойлавым утрыманні круглы год, мы не выкарыстоўваем прыкорм зялёнай масай. Менавіта гэтымі тэхналогіямі і адрозніваемся ад іншых гаспадарак, — уступае ў размову **начальнік аддзела жывёлагадоўлі — галоўны ветурач Алег МЛЕЧКА.** — Даём рагулям толькі канцэнтраваныя кармы: сілас, сянаж. Гэта даражэй, але таго варта. Тып харчавання не мяняецца ў залежнасці ад умоў надвор'я, іншых прычын, бо кармы закансерваваныя. А гэта ўплывае на здароўе кароў, гатунковасць малака.

Штогод у таварыстве надоі малака растуць прыблізна на 2,5 літра ад каровы. І ў планах кожны год прыбаўляць да трох літраў. Напачатку ў гаспадарцы атрымлівалі ад кожнай жывёліны ўсяго восем літраў. І гэта зразумела: на адну карову даводзілася 17 цэнтнераў кармавых адзінак. Цяпер жа забяспечанасць складае больш за 43 цэнтнеры.

— У жывёлагадоўлі нам ёсць куды расці, развівацца і рухацца наперад. Перш за ўсё неабходна паляпшаць умовы ўтрымання кароў. А для гэтага праводзіць рэканструкцыю і мадэрнізацыю комплексу будынкаў, уладкаваць новы даільна-малочны блок. Гэта дарагое заданне, а разлічваць даводзіцца толькі на асабістыя сілы. Таму рамантуем будынкі гаспадарчым спосабам, паціху, пакрыху, — кажа Алег Млечка.



Заатэхнік-селекцыянер Дзмітрый КАЗАК у памяшканні для буйной рагатай жывёлы.

Што датычыцца земляробства, то сёння тут таксама адбываюцца змены да лепшага, шмат цікавага: і культуры, і гібрыды, і сарты новыя. Словам, поле дзейнасці шырокае. У гаспадарцы абнаўляюць машынна-трактарны парк. Сёлета купілі новы культыватар, будуць укараняць прапашную тэхналогію глыбокага рыхлення. Летась у лізінг узялі камбайн.



Начальнік аддзела жывёлагадоўлі — галоўны ветурач Алег МЛЕЧКА задаволены якасцю назапашанага для статка корму.

— А ўсяго прадугледжваецца набыць каля 13 адзінак новай тэхнікі па праграме Аграпрамлізінгу на 1 мільён 200 тысяч рублёў. Паступова выплачваем першапачатковыя ўзносы, — канстатуе Людміла Волахава.

Што датычыцца зарплаты, то яна дастойная — сярэдняя больш за 900 рублёў. Да ўзроўню мінулага года вырасла на 40 %.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

УНП 291332787.

# ЗАРАБЛЯЦЬ І ТРАЦІЦЬ З КАРЫСЦЮ

Паміж Кобрынскім райкамам прафсаюза аграпрамысловага комплексу і ўпраўленнем сельскай гаспадаркі і харчавання падпісана пагадненне. Сацыяльныя партнёры разам вырашаюць шырокі спектр пытанняў. Гэта і стварэнне для сельскіх працаўнікоў належных і бяспечных умоў працы і быту, арганізацыі культурнага адпачынку. Але, бадай, самая галоўная роля прафсаюза — абарона правоў і законных інтарэсаў тых, хто працуе на сяле. Шмат увагі аддаецца і маладым спецыялістам, работнікам.

— Мы разумеем, што пакуль для моладзі не будуць створаны ўмовы, максімальна набліжаныя да гарадскіх, да таго часу на вёсцы будзе адчувацца дэфіцыт кадраў. Бо анкетаванне паказвае: маладым акрамя дастойнай зарплаты, патрэбны належныя адпачынак, сацыяльныя і забаўляльныя, культурныя аб'екты, каб грошы можна было не толькі зарабляць, але і з карысцю іх трацiць, — кажа **старшыня райкама прафсаюза АПК Васіль ЛАЗАРЧУК.**

І, вядома, не забываюць у раёне ўшаноўваць найлепшых працаўнікоў. Сёлета падчас жніва райкам прафсаюза ўзнагародзіў дваццаць чалавек. У асноўным уручалі сертыфікаты. І гэта апраўдана: кожны зможа набыць у краме тое, што лічыць неабходным для дома, гаспадаркі.

Дадам, што ў раёне разам з рознымі службамі, падраздзяленнямі аддаецца шмат увагі ахове працы. І, як вынік, агульнымі сіламі ўдалося выключыць траўматызм у сельскай вытворчасці.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# Сын малой радзімы

Уладкоўваць родную вёску Лелікава Іван Панасюк пачаў задоўга да таго, як у нашай краіне прагучаў заклік зрабіць унёсак у паляпшэнне родных гарадоў і вёсак. У 2006 годзе да 460-годдзя Лелікава расійскі бізнесмен і мецэнат пабудаваў тут сучасны тэнісны корт. Тады на адкрыцці аб'екта ён гаварыў, што хоча зрабіць гэты від спорту даступным для вясковых дзяцей. Займацца тут можна бясплатна, а корт адпавядае ўсім міжнародным стандартам, любыя спаборніцтвы можна праводзіць у Лелікаве. Пра гэта заявілі запрошаныя эксперты — вядомыя беларускія тэнісісты Уладзімір Ваўчкоў, Вольга Барабаншчыкава, прадстаўнікі Беларускай асацыяцыі тэніса.

Цяпер корт актыўна выкарыстоўваецца маладым пакаленнем вяскоўцаў, жыхарамі навакольных населеных пунктаў. Скажам, Андрэй Сацюк ездзіў сюды на заняткі з Дзівіна за сем кіламетраў у школьныя гады. І цяпер, калі Андрэй жыве і працуе ў Брэсце, кожныя выхадныя з сябрамі спяшаецца на корт. А бізнесмен гаворыць, што ён ставіў задачу зрабіць для землякоў недаступнае даступным. І гэта яму, несумненна, удалося.

У свой летні адпачынак Іван Панасюк з сям'ёй абавязкова едзе на малую радзіму. Тут ён узвёў сельскую сядзібу з гасцявым домам, дзе могуць спыняцца спартсмены і аматары тэніса. Як і многія дзелавыя людзі, Іван Паўлавіч жыве на некалькі краін. Значную частку часу праводзіць, напрыклад, у Іспаніі, дзе мае інтарэсы бізнесу. У Новасібірску кіруе Беларускім культурна-асветніцкім цэнтрам «У імя святой Ефрасінні Полацкай». І, вядома, шмат часу праводзіць у роднай вёсцы, дзе заўсёды дапамагае добраўпарадкаваннем царкваў і могілак, іншых сельскіх славутасцяў амаль 500-гадовага Лелікава.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**


**ОАО «Красный Октябрь» извещает акционеров**

**о проведении 30 сентября 2019 года в 11.00 внеочередного общего собрания по адресу:**
г. Витебск, проспект Генерала Людникова, 10

**Повестка дня**

1. О реорганизации ОАО «Красный Октябрь» путем присоединения Унитарного предприятия «Сан Марко» к ОАО «Красный Октябрь».
2. Об утверждении договора о присоединении Унитарного предприятия «Сан Марко» к ОАО «Красный Октябрь».
3. О возложении на директора ОАО «Красный Октябрь» обязанности письменно уведомить всех заинтересованных лиц о предстоящей реорганизации ОАО «Красный Октябрь».
4. Об утверждении цены выкупа акций ОАО «Красный Октябрь» по требованию акционеров.

С материалами по вопросам повестки дня акционеры могут ознакомиться в приемной директора Общества с 23 сентября по 29 сентября 2019 г. в рабочие дни (понедельник—пятница) с 13.30 до 17.00 и 30 сентября 2019 г. по месту проведения собрания.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, будет производиться в день проведения собрания с 10.00 до 10.45.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании, будет составлен на основании реестра владельцев ценных бумаг, сформированного на 16 сентября 2019 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

**Справки по тел. 8-0212-52-55-70.**

**Директор ОАО «Красный Октябрь».** УНП 300003144

**ОАО «Пинский винодельческий завод» сообщает о проведении 18.10.2019 г. первых электронных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества**

**1:** ресторан «Озерный», целевое назначение – здание специализированное для общественного питания площадью 944,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, Браславский р-н, г. Браслав, ул. Советская, д. 115, на земельном участке с кадастровым № 220850100002000104 (площадь – 0,2310 га, право постоянного пользования), год постройки: 1968 г. Составные части и принадлежности: теплосети, кабельная линия, водопровод, канализация. Начальная цена предмета торгов без учета НДС: **117 000,00** бел. руб.

**2:** склад, целевое назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ площадью 193,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская область, Браславский р-н, г. Браслав, ул. Советская, д. 115, на земельном участке с кадастровым № 220850100002000104 (площадь – 0,2310 га, право постоянного пользования), год постройки: 1968 г. Начальная цена предмета торгов без учета НДС: **8 600,00** бел. руб.

**Подробную информацию можно узнать на сайте bankrot.gov.by**

УНП 200110728

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ
ОАО «ЗАВОД СБОРНОГО ЖЕЛЕЗОБЕТОНА № 1»!

**30.08.2019 г. общим собранием акционеров ОАО «Завод сборного железобетона № 1» принято решение о реорганизации в форме выделения.**

Согласно ст. 78 Закона «О хозяйственных обществах» акционеры, голосовавшие против принятия решения о реорганизации, а также акционеры, которые не были надлежащим образом извещены о проведении общего собрания акционеров, на котором было принято такое решение, имеют право требовать выкупа принадлежащих им акций.

Решением общего собрания акционеров от 30.08.2019 г. утверждена цена выкупа акций по требованию акционеров в размере 10 рублей за одну штуку.

Вы вправе направить письменное требование о выкупе акций в срок не позднее 29.10.2019 г.

Письменное требование о выкупе акций должно содержать ФИО (наименование), место жительства (место нахождения), контактный телефон, количество акций, которые требует выкупить акционер, подпись акционера, дату требования. Требование о выкупе акций направляется по адресу: 220070, г. Минск, ул. Передовая, 6. Дополнительная информация по тел. + 375 17 398 95 31.

УНП 100028892

**УП «Белконфискат»** обьявляет о проведении электронных торгов 27.09.2019 г. по продаже имущества, изъятого у Фомина Н. А.

Грузовой пикап Ford Ranger, 2014 г. в., начальной стоимостью 30 240 рублей.

На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809. УНН 190431606